# ТАЛЕРАНТНАСЦЬ ЯК САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ НОРМА Ў КАМУНІКАТЫЎНАЙ ПРАСТОРЫ БЕЛАРУСІ

***В. М. Белакурскі,***
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі гуманітарных навук*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў;*

***Ж. Я. Белакурская,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры міжкультурных камунікацый*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ва ўмовах шматпалярнага свету, які ўзнік у выніку глабалізацыі, талерантнасць заяўляе аб сабе як інтэнцыя агульначалавечых інтарэсаў і патрэб. Яна бачыцца ў якасці неабходнай перадумовы ў разнастайных сацыяльных сувязях і новых формах камунікатыўна-мэтаздольных адносін. Сёння, калі галоўнай патрэбай людзей становіцца згода, менавіта талерантнасць выступае найважнейшай сацыякультурнай нормай у гэтым працэсе.

Дэкларацыя талерантнасці (падпісана 16 лістапада 1995 г. у Парыжы 185 дзяржавамі – членамі ЮНЭСКА) вызначае талерантнасць як «павагу, прынццe і правільнае разуменне багатай шматразнастайнасці культур нашага свету, нашых формаў самавыражэння, а таксама спосабаў праяўлення чалавечай індывідуальнасці» [3].

Уваходжанне Беларусі ў глабальнае супольніцтва звязана сёння з цэлым шэрагам складаных праблем. Перш-наперш, гэта абумоўлена тым, што Беларусі пакуль не ўдалося належным чынам падрыхтавацца да глабальных змен – выпрацаваць адпаведную супрацьвагу тэарэтычнага і ідэалагічнага кшталту, што дапамагло б больш актыўнай інтэграцыі соцыуму ў складаныя міжнародныя працэсы.

Так, даследаванні этнічнай талерантнасці беларусаў, праведзеныя вучонымі Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі, сведчаць аб тым, што найвышэйшыя талерантныя ўстаноўкі рэспандэнтаў былі зафіксаваны ў адносінах да блізкіх славянскіх «суседзяў» – рускіх і ўкраінцаў. Самы нізкі ўзровень талерантнасці адзначаны ў адносінах да цыган, цёмнаскурых, а таксама прадстаўнікоў краін Закаўказзя [4, с. 249].

Неадназначныя дадзеныя ўтрымлівае зборнік «Результаты социологических исследований, проведенных в рамках Национальной системы мониторинга и оценки ситуации по ВИЧ/СПИДу» (Минск, 2014). Найбольш высокі ўзровень талерантнасці рэспандэнты праявілі ў адносінах да сваякоў і сяброў, інфіцыраваных СНІД. Да іншых катэгорый СНІД-інфіцыраваных людзей узровень талерантнасці паніжаецца. Напрыклад, калі працаваць і вучыцца з такімі людзьмі гатовы 52,4 % з апрошаных рэспандэнтаў, то жыць у адным пакоі (кватэры, нумары, інтэрнаце, гатэлі) – толькі 17,9 %. Большасць рэспандэнтаў – 91,3 % не гатовы да стварэння сям'і з СНІД-інфіцыраваным чалавекам [3, с. 62].

Шэраг даследаванняў беларускіх сацыёлагаў паказвае таксама паніжэнне ўзроўню талерантнасці па «вертыкалі» сацыяльнай пабудовы: паміж прадстаўнікамі малазабяспечаных і высоказабяспечаных груп насельніцтва, кіраўнікамі і падначаленымі, элітамі і масамі, уладамі і бізнесам, паміж самімі прадпрымальнікамі.

Усё гэта дае падставы сцвярджаць, што талерантнасць апрыёры не можа быць нейкай атрыбутыўнай і спрадвечна-нязменнай якасцю таго ці іншага этнасу. Яна фарміруецца ў яго культуры ў выніку мэтанакіраваных намаганняў як актуальная патрэба чалавека і грамадства. Як сведчыць рэчаіснасць, нізкі ўзровень талерантнасці ў грамадстве вядзе да непажаданых палітычных наступстваў і ў рэшце рэшт – да сацыякультурнага расколу. Менавіта такі раскол, на думку расійскага даследчыка А. Ахіезера, перашкаджае сёння дынамічнаму развіццю Расіі, паколькі ён выклікаў да жыцця своеасаблівы, «расколаты» тып асобы [1, с. 176].

Праяўленне талерантнасці сёння можна выявіць ва ўсіх сферах грамадскага жыцця нашай краіны. Даследчыкі найперш вылучаюць такія асноўныя яе віды, як талерантнасць этнічная, палітычная, сацыяльная, рэлігійная і інш. Этнічная талерантнасць вызначаецца як добразычлівыя, прыязныя адносіны да прадстаўнікоў іншых этнічных груп, са сваёй культурай і сістэмай каштоўнасцяў. Палітычная талерантнасць – гэта павага і прыняцце кропкі погляду апанента. У наш час палітычная талерантнасць з'яўляецца важнейшай умовай вырашэння палітычных праблем, знаходжання кампрамісаў, пераадолення

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

канфліктаў у сферы палітыкі, дзяржаўнага кіраўніцтва, законатворчай дзейнасці. Сацыяльная талерантнасць заключаецца ў паважлівых адносінах да асаблівасцяў прадстаўнікоў «іншых» сацыяльных груп. Яна праяўляецца ў форме ўзроставай, адукацыйнай, міжасобавай, паўсядзённай, культурнай, гендэрнай, сексуальна-арыентаванай форме і інш. Рэлігійная талерантнасць дапускае прызнанне роўных правоў на існаванне ўсіх рэлігій і рэлігійных канфесій. У супастаўленні з савецкім мінулым сёння ў Беларусі сфарміравана якасна новая рэлігійная сітуацыя, адметнай рысай якой выступае свабода сумлення. Істотным яе кампанентам з'яўляецца прынцып падыходу да паслядоўнікаў любой рэлігійнай плыні без дыскрымінацыі і ўціску па веравызнанні. Паважлівыя, спакойныя і добразычлівыя адносіны паміж прадстаўнікамі розных рэлігійных канфесій, паміж вернікамі і атэістамі сведчаць аб узроўні культуры людзей, цывілізаванасці беларускага грамадства і дзяржавы.

Найважнейшым аспектам праяўлення талерантнасці выступае камунікатыўнасць – імкненне асобы і грамадства ў цэлым да нарматыўных, этыкетных, безканфліктных, гарманізуючых адносін, уменне слухаць субяседніка і паважаць яго меркаванне, захоўваць спакой падчас спрэчак і канфліктных сітуацый, здольнасць спакойна, карэктна і этыкетна весці спрэчкі і дыскусіі. Гарманізацыя зносін людзей дзеля дасягнення сітуацыі камунікатыўнага поспеху выступае менавіта адной з тых задач, якія зараз паўсталі перад беларускім грамадствам.

Сёння, дзякуючы тэхналагічнаму развіццю сеткі Інтэрнэт як новага канала зносін людзей, у сферы камунікацыі ўзнікла прынцыпова новая з'ява – віртуальная камунікацыя. Талерантнасць тут дэманструе такія фармальныя прыкметы, як дыялагічнасць, здольнасць паспяхова пераадольваць межы паміж рознымі слаямі грамадства, каштоўнасны патэнцыял моўнага фонду і г. д. Сацыяльны сайт выступае своеасаблівым полем талерантнай камунікацыі і прадугледжвае вядзенне канструктыўнага дыялогу, заснаванага на талерантных устаноўках. Разам з тым віртуальная камунікацыя правакуе абсалютнае пагружэнне індывіда ў сітуацыю віртуальнага камунікатыўнага акту, дзеператварае яго ў анлайнавую асобу, якая часцей за ўсё не адлюстроўвае моўны вобраз камуніканта і не спрыяе талерантным узаемаадносінам у віртуальнай прасторы. Фармальны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бок талерантнасці прысутнічае, хаця і не так відавочна, у нашым прыватным жыцці, дзе нам нярэдка прыходзіцца ўступаць у камунікацыю з прадстаўнікамі тых груп, з якімі мы не жадалі б мець сацыяльных кантактаў.

У наш час вырашальнае значэнне набывае не нейкая нейтральная цярпімасць да іншых сацыяльных груп, культур, рэлігійных канфесій, а менавіта актыўная, зацікаўленая талерантнасць, заснаваная на рэфлексійных адносінах да асабістай пазіцыі, канструктыўным камунікатыўным узаемадзеянні з носьбітамі іншых поглядаў, ідэй і тэорый. Таму сёння прадстаўляецца надзвычай актуальным надаць асаблівую ўвагу фарміраванню і далейшаму развіццю ў беларускай камунікатыўнай прасторы талерантных адносін. Пазітыўнае разуменне талерантнасці сучасным індывідам можа быць дасягнута праз усведамленне яе супрацьлегласці – інталерантнасці, ці нецярпімасці, заснаванай на перакананні, што толькі тваё асяроддзе, твая сістэма поглядаў, твой вобраз жыцця пераўзыходзяць іншыя і ўзвышаюцца над імі. Практычна інталерантнасць прыводзіць да змянення ў шырокім дыяпазоне формаў паводзін – ад звычайнай нявetлівасці, пагардлівых адносін да людзей іншай нацыянальнасці і культуры да этнічных чыстак і генацыду (як сведчыць гісторыя), наўмыснага і мэтанакіраванага знішчэння людзей.

Механізм фарміравання талерантных паводзін асобы прадугледжвае, на наш погляд, актывізацыю ўсіх сацыяльных інстытутаў грамадства. Перш-наперш, рэалізацыя талерантных адносін у Рэспубліцы Беларусь залежыць ад эфектыўнай дзейнасці па фарміраванні ў грамадстве талерантных установак на трох узроўнях: дзяржаўным, сацыяльным і індывідуальным. Так, у прыярытэтныя дзяржаўныя задачы павінна ўваходзіць каардынацыя ўдзелу Рэспублікі Беларусь у міжнародных праграмах, распрацоўка адукацыйных вучэбных праграм па пытаннях талерантнасці, метадычнага забеспячэння навучальных устаноў усіх узроўняў, а таксама сістэмы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі педагагічных кадраў. Разам з гэтым бачыцца неабходнай далейшая распрацоўка адукацыйных стандартаў і кваліфікацыйных патрабаванняў. Асаблівай ўвагі патрабуе стварэнне праграм псіхалагічнай дапамогі для ахвяр насілля ў сям’і, а таксама праграм перападрыхтоўкі дзяржаўных служачых і супрацоўнікаў праваахоўных органаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Ахиезер, А. С.* Россия: критика исторического опыта (социокультурная динамика России) / А. С. Ахиезер. – Новосибирск : Сиб. хронограф, 1998. – Т. 1 : От прошлого к будущему. – 804 с.

2. Декларация принципов толерантности [Электронный ресурс] : утв. резолюцией 5.61 Ген. конф. ЮНЕСКО от 16 нояб. 1995 г. // Толерантность. – Режим доступа : http://www. tolerance. ru/declar. html.

3. *Кечина, Е. А.* Результаты социологических исследований, проведенных в рамках Национальной системы мониторинга и оценки ситуации по ВИЧ/СПИДу : сб. / Е. А. Кечина. – Минск : ГУ «Республиканский центр гигиены, эпидемиологии и общественного здоровья», 2014. – 106 с.

4. *Сосновская, Н. А.* Толерантность и ее проявление в общественном сознании населения Беларуси / Н. А. Сосновская // Социологический альманах. – 2015. – Вып. 6. – С. 244–252.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ ХУДОЖЕСТВЕННЫХ ОБЩЕСТВ РОССИИ в конце XIX – начале XX в.

***И. Г. Беляева,***
*кандидат педагогических наук,*
*доцент кафедры библиотечно-информационной деятельности*
*и музеологии Смоленского государственного института искусств*

Заглянув в эпоху грандиозных свершений «золотого века» и Серебряного века русской культуры, нельзя не заметить деятельность художественных общественных организаций, созданных просвещенной интеллигенцией русского общества. В основном круг этого общества представляли преподаватели учебных заведений, выпускники Академии художеств, члены различных обществ и кружков. Также большой процент составляли представители знаменитых родов и званий, члены императорской фамилии. Количество общественных организаций, возникших в России в периоды после 1830 и 1850 гг., неуклонно росло. «Третьей волной» стало начало XX в. Влияние обществ было столь весомым, что позволило организовать учебные заведения, ставшие одними из ведущих в начале XX в.

Московское художественное общество было основано 1832 г. группой добровольцев. Своей целью оно провозгласило предоставление «возможности получить художественное образова-